Ад Сталінграда да Прагі

Абаронцы Сталінграда вялі цяжкія баі з насядаўшымі полчышчамі гітлераўцаў. Палалі руіны горада. Дым пажараў засланяў сонца і неба.

У гэтыя грозныя ліпеньскія дні 1942 года тут пачалося франтавое жыццё Рыгора Міхайлавіча Баталава, сына віцебскага чыгуначніка. Яго прызначылі начальнікам аператыўнага аддзела 29-й стралковай дывізіі 64-й арміі. Нярэдка яму даводзілася пакідаць штабныя справы і з аўтаматам у руках разам з салдатамі адбіваць фашысцкія атакі. Потым у яго характарыстыцы будзе зроблен запіс: «Прымаў актыўны ўдзел у абароне Сталінграда, у прарыве варожай абароны, акружэнні і ліквідацыі фашысцкай групоўкі»...

У разгар баёў па знішчэнню 300-тысячнай арміі Паўлюса ў студзені 1943 года адважнага, таленавітага афіцэра назначылі камандзірам 229-га палка. Пад яго кіраўніцтвам полк вызначыўся ў многіх баях. Умела і бясстрашна змагаліся яго воіны. Яны захапілі вялікую колькасць палонных і трафеяў, непасрэдна ўдзельнічалі ў паланенні фельдмаршала Паўлюса і яго штаба. За поспехі ў баях полк быў узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга. Такой жа ўрадавай узнагародай былі адзначаны ратныя заслугі яго камандзіра.

Пасля заканчэння Сталінградскай бітвы 29-й дывізіі была прысвоена назва 72-й гвардзейскай.

У канцы лютага 1943 года дывізія была перакінута да Белгарада. Гвардзейскі полк Баталава з марша заняў абарону ў раёне Маславай Прыстані, дзе адбіў шматлікія спробы ворага фарсіраваць Паўночны Данец. Тут полк стаяў насмерць.



Пачалося ліпеньскае наступленне гітлераўцаў. Полк Баталава, знаходзячыся ў першым эшалоне, прыняў на сябе асноўны ўдар праціўніка. Пазіцыі атакавалі дзве варожыя пяхотныя дывізіі і да 60 танкаў. Здавалася, нішто не магло ўстаяць супраць такога масіраванага тарана. Але баталаўцы выстаялі. Васемнаццаць гадзін працягваўся жорсткі бой з пераўзыходзячымі сіламі ворага. Полк Баталава бліскуча выканаў пастаўленую перад ім баявую задачу. Прасунуўшыся цаной велізарных страт на 1,5—2 кіламетры, фашысты вымушаны былі адмовіцца ад далейшага наступлення на гэтым участку і перайсці да абароны.

Неўзабаве, выматаўшы праціўніка, дывізія перайшла ў контрнаступленне і аднавіла становішча. На плячах адступаючых гітлераўцаў 229-ы гвардзейскі стралковы полк адным з першых фарсіраваў Паўночны Данец, захапіў плацдарм і забяспечыў пераправу галоўных сіл дывізіі і арміі на заходні бераг ракі. За гэту аперацыю, праведзеную з вялікім майстэрствам, Р. М. Баталаў быў узнагароджан другім ордэнам Чырвонага Сцяга.

Разграміўшы фашыстаў пад Белгарадам, дывізія перайшла ў наступленне ў напрамку Харкава, удзельнічала ў яго вызваленні ад захопнікаў.

У верасні 1943 года савецкія войскі, праследуючы адступаўшых гітлераўцаў, выйшлі да Дняпра ў раёне сёл Новы Орлік і Барадаеўка. Пад прыкрыццём воднага рубяжа праціўнік пачаў прыводзіць у парадак свае разгромленыя часці, умацоўваць абарону. Неабходна было з ходу фарсіраваць раку, захапіць плацдарм на яе правым беразе і забяспечыць пераправу асноўных сіл. Выканаць гэту важную задачу камандаванне арміі даручыла палку гвардыі маёра Р. М. Баталава.

У ноч з 24 на 25 верасня 1943 года полк у цяжкіх умовах фарсіраваў Днепр, захапіў плацдарм і замацаваўся на ім. Разам з першымі байцамі пераправіўся на заходні бераг Р. М. Баталаў, каб непасрэдна на месцы кіраваць адказнай аперацыяй. Адбіўшы шалёныя контратакі гітлераўцаў, полк пад прыкрыццём пемры ўварваўся ў сяло Барадаеўку і прымусіў праціўніка ў паніцы адступіць. Баталаўцы прасунуліся наперад на чатыры кіламетры, нанёсшы ворагу вялікія страты і разбурыўшы ўсю сістэму яго абароны. Цераз барадаеўскі плацдарм адразу ж пераправіліся на правы бераг Дняпра дывізія і затым уся армія. Наступленне нашых войск паспяхова працягвалася.

Так, паказваючы асабісты прыклад мужнасці, стойкасці і воінскага майстэрства, Р. М. Баталаў забяспечыў выдатнае выкананне палком пастаўленай задачы. Увесь асабовы састаў палка тады быў адзначан урадавымі ўзнагародамі, а 9 воінам, у тым ліку Р. М. Баталаву, якія асабліва вызначыліся, было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

У жніўні 1944 года Баталаў, будучы намеснікам камандзіра 72-й гвардзейскай стралковай дывізіі, актыўна ўдзельнічаў у правядзенні славутай Яса-Кішынёўскай аперацыі. Дывізія прарвала Тыргу-Фурмоскі ўмацаваны раён ворага, а ў канцы жніўня, пераадолеўшы Карпацкі хрыбет, паспяхова развіла хуткае наступленне ў Трансільваніі. Неўзабаве Баталаў быў узнагароджан ордэнам Кутузава II ступені.

У 1944—45гг. Р. М. Баталаў змагаўся з гітлераўцамі на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі і Аўстрыі, удзельнічаў у вызваленні Будапешта, Браціславы і Прагі.

Р. М. Баталаў быў чатыры разы ранены. Пасля лячэння ён зноў станавіўся ў строй, імкнучыся як мага хутчэй вызваліць родную зямлю ад ненавісных захопнікаў.

Камуніст Р. М. Баталаў прайшоў вогненнымі франтавымі дарогамі ад Сталінграда да Прагі, паказваючы ва ўсіх баях узоры бясстрашнасці, стойкасці і воінскага майстэрства.

Пасля вайны ён закончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе, а ў 1959 годзе — Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР. Да 1971 года служыў у радах Савецкай Арміі, перадаваў маладым воінам і афіцэрам свае багатыя ваенныя веды і вопыт.

Цяпер праслаўлены ветэран вайны жыве ў Кіеве.

Ул. ЛЬВОЎ.

На малюнку: Р. М. Баталаў.